УДК 821.161.3-1Багдановіч

**В. І. Патаповіч**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт»,Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*

# «ВЯНОК ПАЭТЫЧНАЙ СПАДЧЫНЫ» МАКСІМА БАГДАНОВІЧА: ЗМЕСТ, СТРУКТУРА, ПРЫНЦЫПЫ ЎКЛАДАННЯ

**Уводзіны.** Адзіным прыжыццёвым зборнікам вершаў Максіма Багдановіча быў «Вянок», выдадзены ў 1913 годзе ў Вільні ў выдавецтве Марціна Кухты. Выхад у свет «Вянка» з'явіўся сапраўды творчай падзеяй у сусветнай літаратуры, бо аўтар упершыню выкарыстаў еўрапейскія формы вершаў — санет, рандо, актавы, трыялет, — якія раней былі не ўласцівы беларускай літаратуры. Першапачатковая назва зборніка — «Кніжка выбраных вершаў». Па сваёй сутнасці «Вянок» — філасофская кніга, у якой узнаўляюцца факты стварэння культурнай спадчыны Беларусі («Летапісец», «Перапісчык»), згадваюцца міфы і старыя паданні (цыкл «У зачараваным царстве»), асэнсоўваюцца праблемы жыцця і смерці («Жывеш не вечна, чалавек...», «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...»).

**Асноўная частка.** Пасля смерці творы паэта неаднаразова перавыдаваліся. У 1927 годзе ў Мінску выйшаў І том, у 1928 годзе — ІІ том першага акадэмічнага выдання твораў М. Багдановіча пад рэдакцыяй прафесара І. І. Замоціна. На яго аснове і грунтаваліся пазнейшыя выданні выбраных твораў паэта. Мы звярнуліся да такога выдання, як «Вянок паэтычнай спадчыны», выдадзены ў Мюнхене ў 1960 годзе. Матэрыялам для нашага даследавання стала аналітычная праца Антона Адамовіча «Наш Багдановіч» [1, с. 1053—1070], на аснове якой мы вылучылі адметныя рысы ўказанага выдання. Гэтае выданне Ант. Адамовіч называе «новы Багдановічаў Вянок» [1, с. 1053].

Асновай для стварэння «Вянка паэтычнай спадчыны» паслужыла выданне Інбелкульта, з якога была ўзята пераважная большасць тэкстаў. Таксама былі выкарыстаны тэксты з «Нашай Нівы» (прыкладам з'яўляецца верш «Белым цветам», не пададзены ў ніводным з іншых збораў) або з іншых часопісаў (тэкст «Апокрыфа», апублікаваны В. Ластоўскім у часопісе «Крывіч» за 1923 год). Істотным з'яўляецца і тое, што ствральнікі «Вянка паэтычнай спадчыны» мелі магчымасць пакарыстацца рукапісамі самога паэта, якія затым былі страчаны. Як піша Ант. Адамовіч, «Багдановічавы рукапісы не былі перахаваныя Акадэміяй Навук БССР у часе Другой сусветнай вайны і выпушчаны ёю з сваіх рук». Укладальнікі «Вянка паэтычнай спадчыны» мелі магчымасць пакарыстацца часткай гэтых рукапісаў, якія перайшлі былі ў адны прыватныя рукі. Антон Адамовіч адзначае, што, «на жаль, знаходжанне гэтых рукапісаў і іхняга ўладальніка цяпер невядома» [1, с. 1054].

Па вышэйзгаданых абставінах «Вянок паэтычнай спадчыны» атрымаўся крыху больш аб'ёмным, чым выдадзеныя раней зборы паэта. Выключным з'яўляецца тое, што ў зборнік ўвайшлі творы Максіма Багдановіча, нідзе не апублікаваныя да гэтага часу. Напрыклад, вершы «Белым цветам», «Смех і гоман», «Касцёл св. Ганны ў Вільні» (поўны беларускі тэкст), «Заціхніце, мукі кахання», «Credo». Таксама былі змешчаны беларускія тэксты чатырох апавяданняў — «Мадонна», «Сон-трава», «Страшное», «Качулка», — адноўленых у некаторых эміграцыйных перыядычных выданнях («Сакавік», «Бацькаўшчына») [1, с. 1054].

З іншага боку, адбылося і змяншэнне пэўнай часткі аб'ёму за кошт таго, што ў «Вянок паэтычнай спадчыны» не ўведзены рускамоўныя творы М. Багдановіча, а таксама некаторыя пераклады, якія былі справядліва ацэнены як слабыя, яшчэ Віленскай рэдакцыяй. Не ўведзены, таксама, два пачаткі вершаў зусім незакончанага характару: шэсць пачатковых радкоў «Долі мужыка» і ўсяго два радкі верша «Маць Беларусь».

Калі першае выданне збору твораў, выдадзенае Інбелкультам, укладалася на аснове храналагічнага прынцыпу, у пэўнай меры камбінаванага з прынцыпам цыклічным, то «Вянок паэтычнай спадчыны» захаваўся ў цэласнасці і не быў падзелены на асобныя вершы. Гэтае захаванне «Вянка» як адзінкі кнігі лірыкі робіць зборнік, як лічыць Ант. Адамовіч, найбольш дасканалым паэтычным выданнем сярод усіх астатніх. Зборнік змяшчае ў сабе некалькі раздзелаў. У аснову першага раздзела «Перад Вянком» былі пакладзены самыя раннія вершы паэта (напісаныя да 1908 года), другі раздзел меў назву «Пад Вянком», далей змяшчаліся творы непасрэдна пад загалоўкам «Вянок» і, нарэшце, вершы, створаныя ў 1913—1917 гадах, пад загалоўкам «Па Вянку».

Першы цыкл уключае ўсяго 6 ранніх вершаў М. Багдановіча. Другі раздзел, «Бацькаўшчына», спачатку не ўваходзіў у «Вянок паэтычнай спадчыны», але ў канчатковым выніку з гэтага раздзела выйшла «кніга нявыбраных вершаў» як падступ-падыход да самай цэнтральнай «кнігі выбраных вершаў» — «Вянка» [1, с. 1056]. Цыклы вершаў «Каханне і смерць» і «З чужое нівы» не ўвайшлі ў цэнтральны раздзел зборніка «Вянок» 1913 года выдання і нават не ўбачылі свет аж да выдання Інбелкульта (1927). Лічылася, што гэтыя цыклы вершаў змяшчаюць рысы «дэкадэнтшчыны», з-за чаго доўгі час творы Максіма Багдановіча не друкаваліся. Дэкадэнцтва характарызуецца зыходам паэта ў сябе, адчуваннем безнадзейнасці, стратай сэнсу, крызісам творчых ідэалаў, у творчасці пануе тэма смерці, адзіноты. І сапраўды, у паэзіі Багдановіча нямала напамінкаў пра жыццёвы тлен. Маргінальнасць, крохкасць светаадчування, асацыятыўнасць — усё гэта ўваходзіць у мастацкі свет Максіма Багдановіча. Вядома, што паэт захапляўся творчасцю французскага паэта-сімваліста Поля Верлена.

© Патаповіч В. І., 2021



Рэпазіторый БарДУ

Хоць яны належалі да розных стагоддзяў і літаратур, але мелі шмат агульнага — сіметрыя жыццёвых і творчых лёсаў абодвух паэтаў, іх прыхільнасць да сімвалісцкай эстэтыкі.

У зборніку «Вянок паэтычнай спадчыны», адзначае Ант. Адамовіч, была зроблена спроба рэканструяваць уклад самога аўтара не толькі традыцыйным аднаўленнем раздзела «Каханне і смерць», але і вылучэннем і аднаўленнем раздзела «З чужое нівы», які быў змешчаны замест раздзела «Вольныя думы». У гэтыя цыклы ўвайшлі такія творы М. Багдановіча, як «Красавік», «Палын-трава», «На ціхім Дунаі», «Шыпшына». За цыклам «Вольныя думы» ідзе раздзел «З недапрацаванага», у якім змяшчаюцца недапрацаваныя радкі паэта, магчыма 1917 года, навеяныя лютаўскай рэвалюцыяй. У апошнім раздзеле зборніка змяшчаюцца перадсмяротныя радкі, напісаныя паэтам.

Укладанне мастацкай прозы ў «Вянок паэтычнай спадчыны» М. Багдановіча было зроблена на аснове прынцыпу жанравых характарыстык у сукупнасці з храналагічным прынцыпам. Зборнік уключае раздзелы мастацкіх стылізацый 1913—1914 гадоў, белетрыстычных фрагментаў, газетнай белетрыстыкі, хрэстаматыйных урыўкаў 1916 года (артыкулы і рыхтаваная паэтам школьная чытанка). Першы надрукаваны твор М. Багдановіча — апавяданне «Музыка» — з'яўляецца свайго роду ўверцюрай да ўсяго зборніка і займае першае месца сярод астатніх раздзелаў.

Як адзначае Ант. Адамовіч, указанае выданне мае значна большы аб'ём і разнастайнасць укладзенага матэрыялу, чым адрозніваецца ад папярэдніх рэдакцый зборніка «Вянок». Даследчык імкнуўся зрабіць папраўкі, якія датычаць дасканаласці правапісу і чысціні беларускай мовы твораў М. Багдановіча, і выказаў упэўненасць, што «папраўкі гэтага тыпу прыняў бы й сам паэта, а нат мо й сам падобныя парабіў бы…» [1, с. 1067].

**Заключэнне.** У артыкуле прааналізаваны асноўныя змястоўна-фармальныя асаблівасці зборніка «Вянок паэтычнай спадчыны» Максіма Багдановіча, які быў выдадзены ў Мюнхене ў 1960 годзе. Гэтае выданне, як адзначае Ант. Адамовіч, мае большы аб'ём, бо ўключае творы М. Багдановіча, якія не былі апублікаваны ў папярэдніх выданнях яго зборніка «Вянок». «Вянок паэтычнай спадчыны» падзяляецца на наступныя цыклы-раздзелы: «Перад Вянком», «Пад Вянком», «Вянок», «Па Вянку». Укладанне мастацкай прозы ў «Вянок паэтычнай спадчыны» было зроблена на аснове прынцыпу жанравых характарыстык у сукупнасці з храналагічным прынцыпам. Зборнік уключае раздзелы мастацкіх стылізацый 1913—1914 гадоў, белетрыстычных фрагментаў, газетнай белетрыстыкі, хрэстаматыйных урыўкаў. Па сваёй форме і спосабу ўкладання матэрыялу мюнхенскае выданне «Вянка», лічыць Ант. Адамовіч, з'яўляецца больш дасканалым у параўнанні з папярэднімі выданнямі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Адамовіч, А.* Наш Багдановіч / А. Адамовіч // Да гісторыі беларускае літаратуры. — Мінск : Зьміцер Колас, 2005. — С. 1053—1070.

УДК: 821.161.3-95 Баршчэўскі

**П. Р. Пракурат**
*Установа адукацыі Рэспублікі Беларусь «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*

# ЛОКУС ЛЕСУ Ў ТВОРЧАСЦІ Я. БАРШЧЭЎСКАГА

**Уводзіны.** Тэрмін «локус» з'яўляецца дастаткова новым паняццем у літаратуразнаўстве, прыйшоў у філалогію з натуральных навук (біялогіі, псіхалогіі), у апошнія гады яго ўжыванне значна пашырылася ў даследаванні мастацкага тэксту. Упершыню дадзенае паняцце ў дачыненні да гуманітарных навук выкарыстаў фалькларыст С. Няклюдаў у артыкуле «К вопросу о связи пространственно-временных отношений с сюжетной структурой в русской былине» (1966). Гэты тэрмін пачынае актыўна ўжываць і Ю. М. Лотман у артыкулах аб семіётыцы мастацкай прасторы.

Паняцце «локуса» датычыцца ў асноўным да закрытых культурных фрагментах прасторы. У апошнія гады з'явіліся філалагічныя даследаванні, прысвечаныя пошуку азначэнняў гэтаму паняццю і тэкставых катэгорый, якія стаяць за ім. Так, у метадычнай дысертацыі О. Е. Фраловай пад тэкставым локусам разумеецца «прасторавы рэферэнт мастацкага тэксту, які з'яўляецца вынікам выбару пісьменнікам месца (або месцаў), дзе будзе разгортвацца дзеянне» [1, с. 89]. Аналізуючы прозу пачатку XIX стагоддзя, аўтар даследавання звяртаецца да сюжэтных локусаў, разумеючы пад імі месца дзеяння ў сюжэце і кампазіцыі мастацкага тэксту, г. зн. «некаторыя кропкі», фрагменты прасторы, уключаныя ў сінтагматыку тэксту.

У дадзены момант паняцце «локус» не з'яўляецца канчаткова вызначаным, склаліся пэўныя тэндэнцыі ў яго разуменні. Часцей за ўсё локусы трактуюцца як прасторавыя вобразы ў фальклорных і літаратурных

© Пракурат П. Р., 2021

Рэпазіторый БарДУ